УДК 930.23(438): “1921”

# РЫЖСКІ МІР І СТАНОВІШЧА ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

**Цымбал Аляксандр Георгіевіч**
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны вывучэнню поглядаў польскай гістарыяграфіі на становішча праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі ў выніку заключэння Рыжскага мірнага пагаднення 1921 г. у кантэксце дзяржаўнай нацыянальна-канфесійнай палітыкі адносна праваслаўнага беларускага насельніцтва.*

З адраджэннем польскай дзяржавы і заключэннем Рыжскага мірнага пагаднення ў 1921 г. становішча праваслаўнай царквы ў Польшчы і далучанай да яе Заходняй Беларусі ютотна змянілася. Даследчыкамі праблемы становішча праваслаўя ў міжваеннай польскай дзяржаве адзначаецца, што з прывілеяванага веравызнання Расійскай імперыі яна апынулася ў стане царквы рэлігійных і нацыянальных меншасцей. іерархі былі вымушаны арганізоўваць царкоўныя структуры ў польскім грамадстве, дзе пераважную большасць складалі вернікі рымска-каталіцкай царквы. Пагаршалі адносіны да праваслаўя і панаваўшыя ў польскім грамадстве і палітычных колах стэрэатыпы, якія падкрэслівалі русіфікатарскую ролю царквы і разглядалі праваслаўных вернікаў як праціўнікаў Польшчы і каталіцызму. П. Ляшчынскі падкрэслівае, што міжваеннай Польшчы ў поглядах на ролю рэлігіі і царквы ў дзяржаве дамінавала канцэпцыя нацыянальных дэмакратаў, у якой рымска-каталіцкае веравызнанне разглядалася ў якасці сродку пабудовы народнага адзінства, на якое павінна была абапірацца дзяржава [1, s. 51-59]. Была абрана мадэль нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, дзе галоўную ролю адыгрывала рэлігія. З гэтага вынікалі польскія дзяржаўныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інтарэсы, якія звязвалюя з распаўсюджваннем і ўмацаваннем рыма-каталіцызму. Такую агульнанародную веру ўлады імкнулюя цесна звязаць з патрыятызмам. Погляд на каталіцызм як галоўную каштоўнасць, прынцыповы элемент агульнанароднай сувязі ўзнікае з вопыту, які палякі набылі ў перыяд панавання расійскага самадзяржаўя. У той час каталіцкая канфесія з'яўлялася фактарам нацыянальнай прыналежнасці. Даследчыца гісторыі праваслаўя ў Польшчы М. Папежыньска-Турэк падкрэслівае, што такое разуменне ролі рэлігіі ў народзе актыўна прапагандавала і рымска-каталіцкая царква [2, s. 149-150]. Згодна з гэтай канцэпцыяй дзяржаўнасці нацыянальныя меншасці падлягалі культурнай, нацыянальнай і рэлігійнай асіміляцыі.

Польскія ўлады з першых дзён юнавання адроджанай дзяржавы сутыкнулюя з праблемай распрацоўкі прынцыпаў узаемаадносін дзяржавы і праваслаўнай царквы, вызначальнымі фактарамі якіх сталі:

1) знешнепалітычны – улады, памятаючы з гісторыі ролю канфесіянальнага пытання ў падзелах Рэчы Паспалітай, асцерагаліся, што бальшавікі, фактычна падпарадкаваўшы праваслаўную царкву ў СССР і выкарыстоўваючы той факт, што праваслаўная царква ў Польшчы знаходзілася ў юрысдыкцыі РПЦ, будуць імкнуцца праз яе ўплываць на царкву і праваслаўнае насельніцтва Заходняй Беларусі і Украіны і тым самым дэстабілізаваць становішча ў гэтым рэгіёне;

2) унутрыпалітычны – кіруючыя колы Польшчы, разумеючы ўплыў царквы на грамадства, імкнуліся трансфармаваць праваслаўную царкву ў адпаведнасці з асіміляцыйнымі планамі адносна беларускага насельніцтва і зрабіць з яе інструмент інтэграцыі ўсходніх ваяводстваў з этнічна польскімі тэрыторыямі;

3) нацыянальны – ІІ Рэч Паспалітая атрымала ў спадчыну ад Расіі праваслаўную царкву амаль поўнасцю зрусіфікаванай. Амаль усё духавенства ад іерархаў да прыходскіх святароў было рускім калі не па паходжанню, то паводле выхавання. Польскімі чыноўнікамі неаднаразова адзначалася, што духавенства працягвае русіфікатарскую дзейнасць сярод насельніцтва паўночнаўсходніх тэрыторый ІІ Рэчы Паспалітай. Гэта супярэчыла інтарэсам польскай дзяржаўнасці. Улады разглядалі царкву ў якасці сродку палітыкі паланізацыі ў адносінах няпольскага насельніцтва так званых “усходніх крэсаў”;

4) ідэалагічна-рэлігійны – у адроджанай польскай дзяржаве асноўная частка насельніцтва была рымска-каталіцкага веравызнання, і палітычныя сілы разглядалі каталіцтва як аснову дзяржаўнай і нацыянальнай інтэграцыі. Дзяржаўныя інтарэсы цесна звязвалюя з распаўсюджваннем каталіцызму.

Польскія гісторыкі сыходзяцца ў думцы, што на пачатку 1920-х гг. у дзяржаўнай адміністрацыі не існавала адзінай канцэпцыі адносна праваслаўнай царквы. Распрацоўвалюя некалькі варыянтаў канфесіянальнай палітыкі. Мелюя два падыходы да праблемы праваслаўя. Першы разглядаў неабходнасць ліквідацыі, ці выцяснення ўплываў праваслаўнай царквы як магчыма далей на ўсход, што, аднак, пагражала рэлігійнымі канфліктамі. Акрамя таго, існавала верагоднасць, што месца ліквідаванага праваслаўя заняла бы не рымска-каталіцкая царква, а грэка-каталіцкая царква. Другі падыход прадугледжваў арганізацыйную перабудову царквы ў патрэбным дзяржаве кірунку, што азначала поўнае падпарадкаванне праваслаўнай царквы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўраду і выкарыстанне яе дзеля ўмацавання польскай дзяржаўнасці [3, s. 149-150; 4, с. 68-69].

Яшчэ ў 1919 г. Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы накіравала да ўсіх кампетэнтных органаў паведамленне аб становішчы праваслаўнай царквы ў Польшчы, прапануючы магчымыя дзеянні, у першую чаргу, стварэнне ў межах польскай дзяржавы самастойнай праваслаўнай іерархіі, незалежнай ад Маскоўскага Патрыярхату. Таксама мініютэрства займала пазіцыю поўнай незалежнасці праваслаўнай царквы ў Польшчы ад замежных уплываў і лічыла пажаданым дамагацца для яе аўтакефаліі. Адначасова польская дзяржава абавязвалася арганізаваць матэрыяльнае забеспячэнне кліру і супакоіць рэлігійныя патрэбы праваслаўнага насельніцтва. Прыводзілася і гістарычная аргументацыя, што польскія каралі заўсёды імкнулюя да царкоўнай незалежнасці, дамагаючыся паразумення з экуменічным патрыярхам. Таму мініютэрства прытрымлівалася таго пункту гледжання, што перамовы ў гэтай справе патрэбна пачынаць выключна з Канстанцінопальскім патрыярхам, што паказвае ў сваім даследаванні А. Баркоўскі.

Статусу праваслаўнай царквы ў Польшчы датычылюя і палажэнні Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. Акрамя забеспячэння нацыянальным і канфесіянальным меншасцям роўных правоў, бакі дамовілюя не ўмешвацца ў справы ладу і жыцця царквы і рэлігійных арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі іншай дзяржавы. На думку А. Мірановіча палажэнні Рыжскага міру разглядалюя польскімі ўладамі як гарантыя права кантролю дзяржавы над царквой і падстава для набыцця аўтакефаліі.

Такім чынам, польскія гісторыкі адзначаюць, што пытанне праваслаўя было адным з галоўных у нацыянальна-канферсійнай палітыцы ўлад. Кіраўнікі польскай дзяржавы энергічна прыступілі да вырашэння канфесіянальнага пытання. Першым крокам планавалася абвясціць аўтакефалію праваслаўнай царквы ў Польшчы. У аўтакефаліі яны бачылі магчымае збліжэнне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў і сродак асіміляцыі беларускага насельніцтва. Падкрэсліваючы палітычную значнасць гэтага пытання, ініцыятыву ўзялі ўлады.

## Літаратура

1. Leszczyński, P. Centraina administracja wyznaniowa II RP. Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Pubiioznego / P. Leszczyński. – Warszawa : Semper, 2006. – 300 s.

2. Papierzyńska-Turek, M. Charakter i zakres kuituraino – społecznej aktywności Kościoła prawosławnego w Drugiej Rzeczypospolitej / M. Papierzyńska-Turek // Aktywność społeczno – kuituraina Kościołów i grup wyznaniowych w Poisce XIX i XX wieku / Red. M. Medycka, R. Renz. – Kielce : Marka, 1995. – S. 149–160.

3 Kalina, M. Polonizacja Cerkwi prawosławnej w województwie białostockim (1918–1939) / M.Kalina // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1995. – № 2 (4). – S. 74–105.

4. Давідзюк, М. Справа беларусізацыі праваслаўнай царквы ў святле палітыкі польскіх дзяржаўных улад 1918–1939 / М. Давідзюк // Беларускі каляндар. – Беласток, 1990. – С. 67–92.

5. Archiwum Akt Nowych, Ministerstwo wyznań religijnych i oświecenia pubiicznego. – Syg. 960.

6. Borkowski, A. Pertraktacje rządu polskiego z patriarchatem ekumenicznym w sprawie przyznania autokefalii Kościołowi prawosławnemu w Poisce w iatach 1920–1923 / A. Borkowski // Autokefalie Kościoła prawosławnego w Poisce / Uniwers. w Białymstoku ; pod. red. A. Mironowioz, U. Pawiuczuk, P. Chomik. – Białystok : Wydawnictwo Uniwersutetu w Białymstoku, 2006. – S. 123–138.

7. Mironowicz, A. Kościół prawosławny na ziemiach polskioh w XIX i XX wieku / A. Mironowicz. – Białystok : Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2005. – 379 s.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова